WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 жніўня 2011 г.
АЎТОРАК
№ 144 (27008)

Кошт 700 рублёў

## ЗАХАВАЦЬ САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 1 жніўня прыняў з дакладам Прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча.**

Падчас сустрэчы абмяркоўвалася прызначаная на другую палову жніўня нарада з удзелам Урада і Праўлення Нацыянальнага банка, дзе будуць разгледжаны пытанні функцыянавання эканомікі ў сённяшніх умовах і прыняты сур'ёзныя рашэнні па валютнай і эканамічнай палітыцы ў гэтым годзе, а таксама вызначаны задачы на 2012 год. Плануецца выйсці на прынцыповыя рашэнні, якія ў многім вызначаць эканамічную стратэгію беларускай дзяржавы.

Другое пытанне, на якім была засяроджана ўвага, датычылася даходаў насельніцтва і інфляцыі. Кіраўнік дзяржавы асабліва падкрэсліў, што ў цяперашняй сітуацыі неабходна прымаць дзейсныя меры для таго, каб манапалісты вялі сябе карэктна і не ўскладнялі эканамічную абстаноўку. У гэтай сітуацыі павінны быць захаваны сацыяльныя гарантыі для насельніцтва, асабліва найбольш уразлівых сацыяльных катэгорый, перш за ўсё маламаёмных людзей, сем'яў з дзецьмі.

На сустрэчы таксама падрабязна абмеркаваны пытанні пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, якое адбудзецца 15 жніўня ў Маскве.

Кіраўніку дзяржавы далажана таксама аб выкананні Урадам даручэнняў па выдзяленні грамадзянам зямельных участкаў для індывідуальнай жылой забудовы. У гэтай сувязі Прэзідэнт зрабіў шэраг сур'ёзных заўваг па дапрацоўцы прадстаўленых матэрыялаў. У прыватнасці, на думку Аляксандра Лукашэнкі, ёсць яшчэ дастаткова шмат тэрыторый, у тым ліку і вакол Мінска, якія неэфектыўна выкарыстоўваюцца як для патрэб прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва, так і індывідуальнай жылой забудовы. Прытым, што гэтыя землі карыстаюцца вялікім попытам.

Гэта датычыцца не толькі зямель паблізу сталіцы, а ў цэлым тэрыторыі ўсёй краіны. Кіраўнік дзяржавы даручыў, каб работу па навядзенні належнага парадку ў гэтай сферы ўзначалілі старшыні райвыканкамаў. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «ў гэтым пытанні не павінна быць ніякай спекуляцыі».

У цэлым па краіне ўжо вызначана 57 тысяч зямельных участкаў, якія могуць быць выдзелены грамадзянам для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, у тым ліку асобам з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. Урад распрацаваў умовы выдзялення зямельных участкаў і прапанаваў градацыю кошту ў залежнасці ад даходаў таго, хто жадае набыць участак. Так, напрыклад, для шматдзетных сем'яў прапануецца выдзяляць зямлю бясплатна, у тым ліку нават у прыгарадах буйных гарадоў, асобам з патрэбай — за 20% кадастравага кошту ў прыватную ўласнасць або пажыццёвае валоданне, для тых жа, хто мае ва ўласнасці жыллё і хацеў бы пабудаваць індывідуальны жылы дом, — па поўным кадастравым кошце. Акрамя таго, агавораны пытанні, звязаныя з развіццём інжынернай інфраструктуры тэрыторый, якія асвойваюцца.

Кіраўніку дзяржавы таксама было паведамлена пра выкананне шэрагу дадзеных раней даручэнняў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ЖНІВО НА СМАЛЯВІЦКІХ ПАГОРКАХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



**Трактарыст Уладзімір ДРОЗД (на фотаздымку) увозіць са жніўнага поля адразу па дзве тоны збожжа. Гэта якраз чатыры бункеры камбайнаў «Палессе», якія працуюць цяпер на хлебных палетках СВК «Азярыцкі-Агра» Смалявіцкага раёна. Летась механізатар быў лідарам на перавозцы свежанамалочанага хлеба, і сёлета ён зноў у ліку першых. Хоць побач працуюць вопытныя вадзіцелі хуткіх і ёмістых МАЗаў. Сярэдняя ўраджайнасць новага хлеба ў гаспадарцы — 35,2 цэнтнера з гектара, а збожжавы клін — тры тысячы гектараў. Наперадзе ў хлебаробаў шмат гарачых дзён жніва.**

## З 1 ЖНІЎНЯ ПАВЫШАЮЦЦА ПРАЦОЎНЫЯ І САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЕНСІІ

**Адпаведны ўказ № 327 «Аб павышэнні пенсій і ўнясенні змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 кастрычніка 2010 г. № 544» 26 ліпеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамляе БЕЛТА.**

Указам прадугледжана правесці пераразлік працоўных пенсій у жніўні і лістападзе 2011 года, а таксама павысіць памеры сацыяльных пенсій.

З 1 жніўня будзе праведзены пераразлік працоўных пенсій зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы за II квартал гэтага года. Паводле Белстата, яна склала Br1 млн 664 тыс. 498. Таксама будуць павышаны памеры сацыяльных пенсій адносна бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва:

дзецям-інвалідам з 4-й ступенню страты здароўя і інвалідам (у тым ліку з дзяцінства) I групы — з 85 да 110 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму;

дзецям-інвалідам з 3-й ступенню страты здароўя, інвалідам з дзяцінства II групы — з 75 да 95 працэнтаў БПМ;

дзецям-інвалідам з 2-й ступенню страты здароўя, інвалідам II групы (акрамя інвалідаў з дзяцінства), дзецям, якія страцілі бацькоў, — з 65 да 85 працэнтаў БПМ;

дзецям-інвалідам з 1-й ступенню страты здароўя — з 60 да 80 працэнтаў БПМ;

інвалідам (у тым ліку з дзяцінства) III групы — з 55 да 75 працэнтаў БПМ у сярэднім на душу насельніцтва.

Пры гэтым, як паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, памерамі пенсій паглынаецца штомесячная даплата да сацыяльных пенсій (у памеры Br40 тыс.), устаноўленая Указам ад 23 кастрычніка 2010 года № 544.

Акрамя таго, у сувязі з ростам бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва да Br442 тыс. 360 будуць пералічаны мінімальныя працоўныя пенсіі, надбаўкі і павышэнні да пенсій.

У выніку ў жніўні пенсіі павялічацца ў дыяпазоне ад 13 да 17 працэнтаў у залежнасці ад індывідуальных параметраў. Пры гэтым сярэдняя пенсія па ўзросце, паводле ацэнкі, складзе Br798 тыс., пенсія пры стажы 45/40 гадоў і індывідуальным каэфіцыенце заробку пенсіянера 4 — Br1229,7 тыс.

У міністэрстве звяртаюць увагу на тое, што ўстаноўленая Указам ад 27 чэрвеня 2011 года № 263 матэрыяльная дапамога ў памеры да Br150 тыс. мела разавы характар і са жніўня такой выплаты не прадугледжана.

ISSN 1990 - 763X




АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Минского райпо (продавец)

ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже объектов недвижимого имущества в составе:

**Лот № 1:** здание магазина, об.пл. 128,5 кв.м., **Минский р-н, Крупицкий с/с, д. Закружка**.

**Начальная цена с НДС – 87 408 551 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 0,1217 га.**

**Лот № 2:** здание магазина, об.пл. 94,2 кв.м., **Минский р-н, Самохваловичский с/с, д. Углы.**

**Начальная цена с НДС – 33 600 000 бел. руб. (снижена на 50%).**

**Площадь земельного участка – 0,0571 га.**

**Лот № 3:** здание магазина, об.пл. 94,1 кв.м., **Минский р-н, Крупицкий с/с, д. Дубинки.**

**Начальная цена с НДС – 57 240 000 бел. руб. (снижена на 10%).**

**Площадь земельного участка – 0,0514 га.**

Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на **р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, БИК 153001369, УНП 690324015**, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 07.06.2011. Аукцион состоится **17.08.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.08.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**


| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.08.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША....4 945,00 | 1 чэшская крона....294,40 | USD....27,5204 |
| ▲ 1 еўра....7 113,88 | 1 польскі злоты....1785,17 | 10 UAH....34,4113 |
| 1 латвійскі лат....10 039,59 | ▲ 1 расійскі рубель....179,68 | 1000 BYR....55,4959 |
| 1 літоўскі літ....2 062,52 | 1 украінская грыўня....618,26 | EUR....39,6431 |

## НА ВІЦЕБШЧЫНЕ — ПЕРШЫ ТЫСЯЧНІК

**У Чашніцкім раёне камбайнер Валянцін Аўчынка з гаспадаркі «Іванскі-Агра» стаў першым, хто на Віцебшчыне намалаціў ужо звыш тысячы тон збожжавых сёлетняга ўраджаю. І прама ў полі атрымаў спецыяльны дыплом і грашовую прэмію. Жніво ў раёне ўжо «перасягнула экватар». Цікава, дарэчы, што і лідары па ўборцы збожжавых сярод маладзевых экіпажаў таксама з чашніцкай зямлі: браты Дзмітрый і Аляксандр Зябко з сельскагаспадарчага прадпрыемства «Чашніцкае» намалацілі звыш 770 тон збожжа.**

На момант выхаду навіны хлебаробы самай паўночнай вобласці краіны ўжо намалацілі каля пяцісот тысяч тон збожжа — скасілі трэцюю частку плошчаў, якія трэба ўбраць. Як і ў былыя гады, самая высокая ўраджайнасць у Аршанскім раёне — пад 36 цэнтнераў з гектара.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**




АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению СПК «Щомыслица» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **одним лотом:** здания коровника (инв. №600/С-130724), об.пл. **1768.5 кв.м.**; здания телятника (инв. №600/С-130722), об.пл. **722.4 кв.м.**; здания телятника (инв. №600/С-130723), об.пл. **722.8 кв.м.**, расположенных по адресу: **Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район агр. гор. Щомыслица (9; 9/1; 9/2)**.

**Начальная цена с НДС (снижена) – 2 500 000 000 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 1.3898 га.**

Задаток в сумме **150 000 000** бел. руб. перечисляется на **р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369, УНП 690324015**, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 07.07.2011. Аукцион состоится **10.08.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.08.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ Ў СУВЯЗІ СА ШМАТЛІКІМІ АХВЯРАМІ ПАВОДАК У РЭСПУБЛІЦЫ КАРЭЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні Прэзідэнту Рэспублікі Карэя Лі Мен Баку ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі паводак і апоўзняў, выкліканых беспрэцэдэнтна моцнымі дажджамі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў словы падтрымкі і спачування родным і блізкім загінулых, а таксама пажаданні хуткага выздараўлення і вяртання ў свае дамы ўсім пацярпелым ад стыхійнага бедства.

## ЕБРР ПАЛЕПШЫЎ ПРАГНОЗ РОСТУ ЭКАНОМІКІ БЕЛАРУСІ НА 2011 ГОД

**У параўнанні з майскім прагнозам Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР) палепшыў прагноз росту эканомікі Беларусі ў 2011 годзе з 3 да 5 працэнтаў. Аб гэтым паведамляецца ў ліпеньскай рэдакцыі прагнозу ЕБРР для 29 краін з пераходнай эканомікай, у якіх банк ажыццяўляе сваю дзейнасць.**

Паводле ацэнак ЕБРР, зробленых у ліпені, узровень інфляцыі ў Беларусі ў гэтым годзе складзе 35 працэнтаў, прыцягненне чыстых замежных інвестыцый — 3 працэнты ВУП. Дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту Беларусі ў 2011 годзе прагназуецца на ўзроўні 1,7 працэнта ВУП, дэфіцыт рахунку бягучых аперацый аплатнага балансу — 15,7 працэнта ВУП.

**ОАО «Управление механизации № 91»**
извещает своих акционеров, что внеочередное собрание акционеров состоится 31 августа 2011 года в 10 часов по адресу: **г. Минск, ул. Комсомольская, 11.**

Регистрация участников начинается с 08 часов 45 минут по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

Повестка дня:

**1.** Об увеличении уставного фонда Общества путем дополнительного выпуска акций с передачей их в собственность Республики Беларусь.

**2.** О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.

**Тел. 226 77 63.**

**Наблюдательный совет ОАО «Управление механизации № 91».**

*УНП 100055130*

## ТЭРАРЫСТАМ «СВЕЦІЦЬ» СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

*Справа аб выбуху ў мінскім метро хутка будзе перададзена ў суд*

**Скончылася папярэдняе расследаванне крымінальнай справы аб тэракце ў мінскім метро ў красавіку гэтага года, а таксама аб выбухах у Мінску ў 2008 годзе і Віцебску ў 2005-м. Учора матэрыялы справы (больш 550 тамоў) былі перададзены пракурору для накіравання ў суд. Мяркуецца, што слуханні будуць праходзіць у Вярхоўным судзе, паведаміў журналістам намеснік генеральнага пракурора Беларусі, начальнік следчага ўпраўлення Генпракуратуры Андрэй ШВЕД.**

Нагадаем, што па гэтай крымінальнай справе праходзяць двое абвінавачваных — Уладзіслаў Кавалёў і Дзмітрый Канавалаў, абодва ўраджэнцы Віцебска 1986 года нараджэння.

Паводле слоў Андрэя Шведа, Кавалёў абвінавачваецца ў больш чым 15 эпізодах злачыннай дзейнасці (саўдзел у акце тэрарызму ў мінскім метро, незаконны абарот выбуховых рэчываў, неданясенне аб злачынстве і інш.). Канавалаву ставіцца ў віну здзяйсненне больш за 30 злачынных эпізодаў, у тым ліку ён абвінавачваецца ў 4 актах тэрарызму, незаконных дзеяннях з выбуховымі рэчывамі.

Намеснік пракурора падкрэсліў, што з першых дзён расследавання маладым людзям забяспечана права на абарону. Пасля азнаямлення з матэрыяламі справы ніякіх хадайніцтваў, скаргаў і заяў, якія б сведчылі аб парушэнні гэтага права, з іх боку і з боку іх адвакатаў не паступала.

У працэсе расследавання крымінальнай справы не выяўлена дадзеных, якія ўказвалі б на тое, што за спінай Кавалёва і Канавалава стаялі заказчыкі тэракта. На рахунку абвінавачваных — гібель 15 грамадзян Беларусі, сотні пакалечаных жыццяў, матэрыяльны ўрон ў памеры больш за Br2 млрд. Дарэчы, максімальнае пакаранне, якое прадугледжана артыкулам 289 («Тэрарызм») Крымінальнага кодэкса — смяротная кара.

**Надзея ДРЫЛА.**

12 августа 2011 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс».

Повестка дня:

1. О приобретении акций собственного выпуска на баланс Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.

Начало регистрации участников собрания: 13.00.

*УНП 400078768*

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю былога намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі другога склікання па сацыяльных пытаннях ГРЫГАРОВІЧ Ядзвігі Дамінікаўны і выказвае шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.**

### Спорт-тайм

## Раналда адправіў беларусаў у «групу смерці»

У Рыа-дэ-Жанэйра прайшло лёсаванне адборачнага турніру да чэмпіянату свету-2014, які пройдзе ў Бразіліі. Нашай камандзе з цяжкай рукі славутага бразільскага футбаліста Раналда трапіліся такія супернікі, што горш і не прыдумаеш. Найперш чэмпіёны свету іспанцы, а таксама экс-чэмпіёны свету французы — адзіны, дарэчы, гранд з другога кошыка. Дапаўняюць «групу смерці» не самыя слабыя каманды з чацвёртага і пятага кошыкаў — Грузія і Фінляндыя. Акрамя таго, Беларусь трапіла ў адзіную групу з пяці камандаў, дзе няма яўных аўтсайдараў кшталту Мальты ці Андоры. У фінальную частку выходзяць толькі каманды, якія зоймуць першыя месцы, і 8 зборных, якія фінішуюць другімі, паспрачаюцца за пуцёўкі ў Бразілію ў стыкавых паядынках. Турнір стартуе восенню 2012 года.

**A:** Харватыя, Сербія, Бельгія, Шатландыя, Македонія, Уэльс.

**B:** Італія, Данія, Чэхія, Балгарыя, Арменія, Мальта

**C:** Германія, Швецыя, Ірландыя, Аўстрыя, Фарэрскія Астравы, Казахстан.

**D:** Галандыя, Турцыя, Венгрыя, Румынія, Эстонія, Андора.

**E:** Нарвегія, Славенія, Швейцарыя, Албанія, Кіпр, Ісландыя.

**F:** Партугалія, Расія, Ізраіль, Паўночная Ірландыя, Азербайджан, Люксембург.

**G:** Грэцыя, Славакія, Боснія і Герцагавіна, Літва, Латвія, Ліхтэнштэйн.

**H:** Англія, Чарнагорыя, Украіна, Польшча, Малдова, Сан-Марына.

**I:** Іспанія, Францыя, **Беларусь,** Грузія, Фінляндыя.

## У дынамаўскім дэрбі мінчане прайгралі

У нядзелю адбылося тры матчы 19-га тура чэмпіянату Беларусі па футболе. Сталічнае «Дынама», якое ў апошніх чатырох турах не ведала паражэнняў і дзякуючы гэтаму ўзнялося на трэці турнірны радок, нечакана саступіла аднаклубнікам з Брэста, якія вядуць барацьбу за выхад з зоны вылету. На два мячы ў свае вароты сталічная каманда не здолела нічым адказаць — 2:0 на карысць брэсцкай дружыны. «Мінск» перайграў «Нёман» — 3:1, а «Шахцёр» разграміў «Нафтан» — 3:0. Нагадаем, што ў пятніцу барысаўскі БАТЭ абыграў у гасцях «Віцебск» — 1:0. У суботу «Тарпеда-БелАЗ» і магілёўскі «Днепр» згулялі ўнічыю. Яшчэ адна гульня тура — паміж «Гомелем» і «Белшынай» — перанесеная на 4 верасня.

Становішча камандаў: БАТЭ — 44 ачкі (розніца мячоў 35-8), «Шахцёр» — 36 (25-11), «Дынама» (Мн) — 27 (23-21), «Нафтан» — 27 (27-27), «Гомель» — 25 (20-13), «Тарпеда-БелАЗ» — 25 (21-24), «Белшына» — 24 (24-24), «Нёман» — 22 (18-26), «Мінск» — 21 (22-26), «Віцебск» — 21 (16-24), «Дынама» (Бр) — 16 (20-31), «Днепр» — 15 (17-33).

**Алена КРАВЕЦ.**

Минский городской центр недвижимости

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**
**6 сентября 2011 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН № 11-А-11**
**на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 4 земельных участков для строительства в г. Минске:

| № п/п | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.) | Условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | просп. Дзержинского (в районе СООО «Минский международный образовательный центр Иоханнеса Рау») | 500000000005005792 | 1,1757 | Административно-деловой многофункциональный комплекс | 1 660 788 323 | 166 000 000 | 4 945 447 | – |
| 2. | Район пересечения ул. Гурского – ул. Я.Брыля в микрорайоне Михалово-2 | 500000000005005737 | 0,5000 | Торгово-обслуживающий комплекс с помещениями общественного питания по генплану № 21 | 697 747 320 | 69 000 000 | 5 721 311 | – |
| 3. | ул. Ваупшасова в районе пересечения с ул. Солтыса | 500000000001033627 | 0,1500 | Объект торговли с помещениями общественного питания | 193 422 140 | 19 000 000 | 4 676 904 | – |
| 4. | Микрорайон Масюковщина-4 | 500000000006006191 | 0,2612 | Магазин смешанной торговли, сбербанк, парикмахерская по генплану № 8а | 327 875 808 | 32 000 000 | 5 091 314 | – |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **6 сентября 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (не позднее 31 августа 2011 г.)** в размере, указанном в графе 7 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

**Дополнительно представляется:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 3 августа 2011 г. по 31 августа 2011 г. по рабочим дням в рабочее время.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории).

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: +375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

### Абзац

◢ Колькасць насельніцтва Мінска на 1 ліпеня г.г. склала 1868 тыс. чалавек і ў параўнанні з пачаткам года павялічылася на 3,9 тыс. чалавек.

◢ **У Дубровенскім раёне патанула дзяўчынка, якой у ліпені споўнілася год і сем месяцаў. Трагедыя здарылася ў адным з прыватных дамоў у вёсцы Чыжоўка. Каля жылога будынка стаяла бочка, куды злівалася вада з даху. Малая нейкім чынам паднялася да краю ёмістасці і звалілася ў бочку.**

### Поўны абзац

◢ 100-гадовая брытанка кіруе машынай ужо 85 гадоў: без правоў і аварый. Пегі Ховэл — адна са старэйшых кіроўцаў у свеце. Кіраваць машынай яна навучылася ў 1925 г., калі ёй было ўсяго 15. На аўтамабілі юная Пегі ездзіла ў школу. Абавязковыя тэсты для кіроўцаў былі ўведзеныя ў Вялікабрытаніі толькі ў 1935 г., да таго часу дзяўчына была вопытным кіроўцам і не палічыла патрэбным атрымліваць правы. І толькі два гады таму, калі місіс Ховэл споўнілася 98, яна прайшла ўсе неабходныя тэсты. Яе абурыла нахабства страхавой кампаніі, якая рэзка павялічыла кошт страхоўкі ў сувязі з узростам жанчыны. Інструктар, што прымаў іспыты ў Пегі, быў уражаны яе рэакцыяй і акуратнасцю. Між тым сталая дама спецыяльна выбірала дарогі з самым інтэнсіўным рухам, каб прадэманстраваць свае навыкі. У выніку сума страхоўкі была зніжана, а Пегі атрымала афіцыйны дакумент. За сваё жыццё яна змяніла 11 машын і ні разу не трапіла ў аварыю.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## Мінчанін збіў пешахода і ўцёк, схаваўшы труп

**Жыхар Мінска на аўтамабілі збіў пешахода, схаваў яго труп і з месца здарэння ўцёк. Праўда, раніцай вярнуўся туды са сваяком, які і звярнуўся ў міліцыю.**

29 ліпеня каля 23 гадзін паблізу вёскі Сцігане Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці 48-гадовы жыхар Мінска выехаў на паласу сустрэчнага руху і наехаў на пешахода, які рухаўся ў сустрэчным кірунку. Мужчына 1947 г.н., жыхар вёскі Ліпнікі, загінуў на месцы здарэння. Кіроўца схаваў труп пешахода. Пешшу ён дабраўся да вёскі Гальшаны Ашмянскага раёна. А раніцай вярнуўся на месца здарэння са сваяком, які і паведаміў пра ДТЗ у Іўеўскі РУУС.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Гродненский филиал
## РУП «Институт недвижимости и оценки»

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ №1** | **Нежилое помещение** на 1 этаже площадью **6, 3 м.кв.,** расположенное по адресу: **г. Гродно, ул. М. Горького, 24,** в хорошем состоянии, центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, канализация, без естественного освещения. Срок аренды – 5 лет. Предполагаемое целевое использование – для размещения офисов, производственных целей (за исключением вредных производств), осуществления торговли, оказания услуг |
| Начальная цена продажи | 55 125 белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 5 513 белорусских рублей без учета НДС |
| **ЛОТ №2** | **Нежилое помещение** на 2 этаже площадью **13,7 м.кв.,** расположенное по адресу: **г. Гродно, ул. М.Горького, 24,** в хорошем состоянии, центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, канализация, без естественного освещения. Срок аренды – 5 лет. Предполагаемое целевое использование – для размещения офисов, производственных целей (за исключением вредных производств), осуществления торговли, оказания услуг |
| Начальная цена продажи | 119 875 белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 11 988 белорусских рублей без учета НДС |
| **ЛОТ №3** | **Нежилое помещение** на 2 этаже площадью **17,8 м.кв.,** расположенное по адресу: **г. Гродно, ул. М. Горького, 24,** в хорошем состоянии, центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, канализация. Срок аренды – 5 лет. Предполагаемое целевое использование – для размещения офисов, производственных целей (за исключением вредных производств), осуществления торговли, оказания услуг. |
| Начальная цена продажи | 155 750 белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 15 575 белорусских рублей без учета НДС |
| **ЛОТ №4** | **Нежилое помещение** на 2 этаже площадью **17,6 м.кв.,** расположенное по адресу: **г. Гродно, ул. Калиновского, 75,** в хорошем состоянии, центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, канализация. Срок аренды – 5 лет. Предполагаемое целевое использование – для размещения офисов, производственных целей( за исключением вредных производств), осуществления торговли, оказания услуг, размещения складских помещений |
| Начальная цена продажи | 154 000 белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 15 400 белорусских рублей без учета НДС |
| **ЛОТ №5** | **Нежилое помещение** на 2 этаже площадью **16,6 м.кв.,** расположенное по адресу: **г. Гродно, ул. Калиновского, 75,** в хорошем состоянии, центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, канализация. Срок аренды – 5 лет. Предполагаемое целевое использование – для размещения офисов, производственных целей (за исключением вредных производств), осуществления торговли, оказания услуг, размещения складских помещений |
| Начальная цена продажи | 145 250 белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 14 525 белорусских рублей без учета НДС |
| **ЛОТ №6** | **Нежилое помещение** на 2 этаже площадью **16,0 м.кв.,** расположенное по адресу: **г. Гродно, ул. Калиновского, 75,** в хорошем состоянии, центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, канализация.Срок аренды – 5 лет. Предполагаемое целевое использование – для размещения офисов, производственных целей (за исключением вредных производств), осуществления торговли, оказания услуг, размещения складских помещений |
| Начальная цена продажи | 140 000 белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 14 000 белорусских рублей без учета НДС |
| **ЛОТ №7** | **Нежилое помещение** на 2 этаже площадью **10,7 м.кв.,** расположенное по адресу: **г. Гродно, ул. Калиновского, 75,** в хорошем состоянии, центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, канализация. Срок аренды – 5 лет. Предполагаемое целевое использование – для размещения офисов, производственных целей (за исключением вредных производств), осуществления торговли, оказания услуг, размещения складских помещений |
| Начальная цена продажи | 93 625 белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 9 363 белорусских рублей без учета НДС |
| **ЛОТ №8** | **Нежилое помещение** на 2 этаже площадью **19,4 м.кв.,** расположенное по адресу: **г. Гродно, ул. Калиновского, 75,** в хорошем состоянии, центральное отопление, электроснабжение, водоснабжение, канализация, имеется эвакуационный выход. Срок аренды–5 лет. Предполагаемое целевое использование – для размещения офисов, производственных целей (за исключением вредных производств), осуществления торговли, оказания услуг, размещения складских помещений |
| Начальная цена продажи | 169 750 белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 16 975 белорусских рублей без учета НДС |
| Арендная плата | Арендная плата рассчитывается в соответствии с Положением о порядке определения арендной платы при сдаче в аренду кап. строений(зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей, утвержденного Указом Президента РБ от 23.10.2009 г. №518 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом», с применением коэффициента 3,0 согласно п.9.2 данного Положения |
| Продавец | Гродненский филиал РУП «Белпочта», 230025, г. Гродно, ул. К. Маркса, 29, т. 745322 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41 98 32, 41 98 34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора аренды недвижимого имущества | не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/сч для перечисления задатка | Р/с 3012286350011 отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк» код банка 152101705, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 11 августа 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**
**Последний день приема заявлений – 10 августа 2011 г. до 15.00.**

***Телефон для справок: 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».***
***Информация о первом аукционе была опубликована в газете «Звязда» №107 от 10.06.2011 г.***
***дополнительная информация:www.ino.by***



**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

- **Оценка оборудования и транспортных средств**
- **Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности**
- **Независимая строительная экспертиза**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ**

| № лота | Наименование объекта/Краткая характеристика | Адрес объекта | Продавец | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание «Производственный корпус» (инв. №350/С–9761)** Здание, общей площадью 11100, 2 кв.м | г. Гомель, ул. Ильича, 331 | ОАО «Гомельское ПО «Кристалл» | 13 218 237 600 | 1 321 823 760 |

| | |
|---|---|
| Условие продажи | Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 15%, вознаграждение – 1% от цены продажи лота |
| Срок подачи заявления | **До 17–00 31 августа 2011 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46 |
| Дата, время, место проведения аукциона | **1 сентября 2011 г. в 11–00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012000511012 в ЗАО «Цептер БАНК», ЦБУ 5, ул. Платонова, 1б, БИК 153001820, УНП 807000214 |
| Условие пользования | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 63 (факс).**


Барыс БАТУРА:

# «УСЁ ТОЕ, ШТО ПЕРШАПАЧАТКОВА ЗАДУМВАЛІ, МЫ ДАВЯДЗЁМ ДА КАНЦА»

**МАЛАДЗЕЧНА — з улікам яго багатых культурных, гістарычных, спартыўных традыцый — даўно заслугоўваў увагі, таму выбар яго ў якасці пляцоўкі для юбілейных, 15–х, рэспубліканскіх Дажынак быў заканамерным. Сёння Маладзечна — гэта адна суцэльная будоўля, на якой задзейнічана паўсотні профільных арганізацый.**

Як патлумачыў **старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Барыс БАТУРА**, за час падрыхтоўкі да галоўнага свята хлебаробаў у горадзе выканана каля 70 працэнтаў аб'ёмаў запланаваных работ. Усе мерапрыемствы можна падзяліць на тры асноўныя кірункі: упарадкаванне вуліц, капітальны і бягучы рамонт 200 жылых дамоў і работы на двух знакавых аб'ектах — будаўніцтве спартыўна–відовішчнага цэнтра і рэканструкцыі гарадскога парку з амфітэатрам. Апроч таго, паралельна прыводзяцца ў парадак каля 120 аб'ектаў сацыяльнай сферы — бальніцы, школы, басейны, стадыёны і інш., будуецца новы жылы мікраараён.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кіраўнік абласнога выканаўчага камітэта звярнуў увагу на тое, што добраўпарадкаванне не абмяжоўваецца толькі горадам, а тычыцца ўсяго Маладзечанскага раёна. Тут наводзіцца парадак на зямлі, добраўпарадкоўваюцца сельгаспрадпрыемствы, рэканструююцца старыя малочнатаварныя фермы і зернесушыльныя комплексы, будуюцца новыя.

Значны аб'ём работ быў праведзены па ўпарадкаванні аўтамабільных дарог, першачарговая ўвага — трасе Мінск—Маладзечна, дзе асноўныя работы ўжо завершаныя. Засталося давесці да ладу толькі невялікі адрэзак дарогі ля Заслаўя і належным чынам аформіць уезды ў сам Маладзечна. Усё гэта будзе выканана ў запланаваны тэрмін, паабяцаў кіраўнік Мінаблвыканкама. На мяжы Мінскай вобласці і Маладзечанскага раёна ўладкоўваюцца пляцоўкі для сустрэчы святочных дэлегацый.

Барыс Батура падкрэсліў, што ўсе планы добраўпарадкавання горада праведзены з улікам яго гістарычнай і горадабудаўнічай спадчыны, сучасных маштабаў і тэндэнцый прасторава–планіровачнага будаўніцтва.

— Мы намагаемся зрабіць так, каб юбілейныя Дажынкі засталіся ў памяці надоўга і каб яны выгадна адрозніваліся ад папярэдніх «Дажынак» — і па сцэнарыі правядзення, і па афармленні горада, — заявіў старшыня Мінаблвыканкама.

Барыс Батура не стаў раскрываць усіх сакрэтаў падрыхтоўкі, але запэўніў, што арганізатары пастараюцца зрабіць усё, каб госці сёлетніх рэспубліканскіх «Дажынак» адчувалі сябе ў Маладзечне ўтульна і камфортна.

Паглядзець у горадзе будзе на што. Напрыклад, упершыню свята хлебаробаў пройдзе не на адкрытай пляцоўцы — асноўныя мерапрыемствы разгорнуцца ў рэканструяваным амфітэатры на 2600 месцаў, размешчаным у парку (між іншым, яшчэ да Дажынак яго пляцоўку «абкатаюць» майстры сцэны падчас чарговага Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі, які пройдзе ў апошнія выхадныя жніўня). У Горадзе майстроў будуць прадстаўлены народныя рамёствы з 22–х рэгіёнаў вобласці. Асаблівай увагі заслугоўвае паркавая зона. Амфітэатр будзе абкружаны двума штучнымі азярцамі, там жа з'явяцца каскадныя фантаны, ратонды, альтанкі.

Ужо завершаны асноўныя работы па рэканструкцыі цэнтральнай гарадской плошчы, якая мяжуе з паркам. Засталося ўстанавіць скульптурную кампазіцыю ў цэнтры музычнага фантана. Яе сюжэт навеяны купальскімі абрадамі — хлопец, дзяўчына і папараць–кветка ***(на фота).***

Фота БЕЛТА.


Між іншым, вакол гэтай скульптуры разгарнуліся спрэчкі. Некалькі неабыякавых маладзечанцаў палічылі, што ёй не месца ў цэнтры горада і нават сабралі подпісы супраць яе ўстаноўкі. Барыс Батура так патлумачыў гэтую сітуацыю:

— Не бывае такога, каб усе заўсёды былі задаволены. Подпісаў супраць устаноўкі скульптурнай кампазіцыі было сабрана каля сотні, але ж у Маладзечне пражывае каля ста тысяч чалавек. Апроч таго, рашэнне аб устаноўцы кампазіцыі прымаў не асабіста я (хоць я — за яе), а Савет па манументальным мастацтве. Чаму мы ўсё павінны выяўляць у цёмных змрочных фарбах? Чаму ў цэнтры горада павінен стаяць толькі помнік Леніну ці яшчэ некаму? Чаму там не месца гэтай кампазіцыі, у прыгожым музычным фантане? Жыццё павінны быць святам!

Безумоўна, усіх не пераканаць, але чаму, напрыклад, я павінен пераконваць маладзечанцаў, што на кожным балконе павінны быць кветкі? Некаторыя жыхары шматпавярховак на пачатку нават не пускалі нас у кватэры павесіць на балконах кветніцы. Цяпер сітуацыя мяняецца, мяняецца стаўленне. Людзі пераконваюцца, што кветкі на балконах — гэта нармальна і што дзякуючы ім нават шматпавярхоўка можа стаць прыгожым утульным домам.

Вяртаючыся да тэмы спрэчак вакол скульптурнай кампазіцыі ў фантане, **галоўны архітэктар Мінскай вобласці Аляксандр ВАЛОВІЧ** дадаў, што ў ходзе правядзення рэканструкцыі адбылося змяненне функцыянальнага занавання тэрыторыі. Змяніліся акцэнты. Цяпер частка плошчы, дзе месціцца фантан, уваходзіць у паркавую зону сямейнага адпачынку, таму нейкія патэтычныя скульптуры там будуць выглядаць недарэчна. А пара маладых людзей і папараць–кветка сімвалізуюць знойдзенае шчасце кахання, сям'ю і вельмі арганічна ўпісваюцца ў агульную карціну.

...Нягледзячы на няпростую эканамічную сітуацыю ў краіне, план падрыхтоўкі да рэспубліканскіх Дажынак у Маладзечне скарочаны не будзе.

— Усё тое, што першапачаткова задумвалі, мы давядзём да канца, — заявіў Барыс Батура, — скарачэння аб'ёмаў на сёння няма.

Кіраўнік абласнога выканкама падкрэсліў, што добраўпарадкаванне горада трэба разглядаць не толькі як навядзенне прыгажосці напярэдадні рэспубліканскага свята, а як стварэнне дастойнага асяродку пражывання ў статысячным горадзе. Што тычыцца фінансавання, з рэспубліканскага бюджэту гораду запланавана выдаткаваць столькі ж, колькі і астатнім населеным пунктам, дзе праходзілі рэспубліканскія Дажынкі, — 80 млрд рублёў. Каля 90 працэнтаў гэтай сумы горад ужо атрымаў. Два аб'екты — спартыўна–відовішчны комплекс і парк з амфітэатрам — фінансаваліся папалам з абласным бюджэтам. Былі прыцягнуты і сродкі мясцовых прадпрымальнікаў, у прыватнасці, яны выступілі з ініцыятывай набыць на ўвесь горад кветніцы і кветкі для іх. Апроч таго, дадатковы капітал уліваецца ў бюджэт пры будаўніцтве некалькіх новых гандлёвых цэнтраў, якія хутка з'явяцца ў Маладзечне. Барыс Батура выказаў падзяку ўсім міністэрствам і ведамствам за тое, што яны прыводзяць у належны парадак свае гарадскія аб'екты.

Пры правядзенні рэканструкцыі ў парку і на цэнтральнай плошчы горада была высечана пэўная колькасць аварыйных дрэў. Ім на замену ўжо высаджана 1,5 тысячы новых. І гэтая праца будзе працягвацца. Барыс Батура звярнуў увагу на тое, што ў Мінскай вобласці прынята рашэнне высаджваць дрэвы з дыяметрам ствала не меншым за 8 см. І менавіта такія дрэвы высаджваюцца ў Маладзечне.

Пры правядзенні падрыхтоўкі горада да святкавання рэспубліканскіх Дажынак мясцовая ўлада па магчымасці задзейнічае і саміх жыхароў (суботнікі, конкурсы па добраўпарадкаванні), але, на думку старшыні Мінаблвыканкама, гэтая работа вядзецца недастаткова актыўна і вынікова. Трэба пераконваць людзей у неабходнасці далучацца да абнаўлення свайго горада, сваёй вуліцы, двара, самім удзельнічаць у паляпшэнні свайго асяродку пражывання.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

### Што такое быхаўскі кластар

Рада аб'ядноўвае сілы гаспадароў сядзіб і мясцовых улад, каб вырашыць усе надзённыя праблемы і паспрыяць развіццю новай галіны.

— На адным з семінараў у сталіцы мы даведаліся пра ізраільскую мадэль развіцця экатурызму, якая называецца кластарнай, — растлумачыў **начальнік аддзела фізкультуры, спорту і турызму Быхаўскага райвыканкама Яўген Гладкоў.** — Гэта абмен турыстамі, каб яны пабылі найбольшую колькасць дзён у рэгіёне. Кожная сядзіба ўнікальная па-свойму, і калі турыст паглядзеў усё ў адным месцы і хоча нечага новага, ён можа пераехаць на іншае месца.

Сёння Быхаўскі раён — адзін з лідараў па развіцці аграэкатурызму ў Магілёўскай вобласці. Тут дзейнічаюць два дзясяткі сядзібаў, усе розныя — паляўнічыя, для аматараў рыбалкі, гісторыка-краязнаўчага ўхілу і гэтак далей.

Гаворыць, што калі ў 2008 годзе ў гэтым раёне сталі з'яўляцца першыя аграэкасядзібы, то яны сталі станоўчым прыкладам таго, як шмат атрымліваецца, калі ёсць мэта і жаданне дзеля яе працаваць.

— Першыя гаспадары атрымалі крэдыты і развіваліся дынамічна, — каментуе Яўген Гладкоў. — Людзі ўбачылі, што гэта дазваляе і вёску ажывіць, і зарабіць грошы. Плюс — вялікі прыродны патэнцыял Быхаўшчыны.

**У Быхаўскім раёне стварылі грамадскую раду па развіцці аграэкатурызму. Надзённыя праблемы — абмен кліентамі і стварэнне экалагічнага маршруту «Быхаўскія закуткі».**

«Зялёны» маршрут па Дняпры.



# ЗЯЛЁНЫЯ ВАНДРОЎКІ

выхадныя дні, давядзецца дамаўляцца загадзя, — раіць **галоўны спецыяліст аддзела фізкультуры, спорту і турызму Тацццяна Дрыбінская.** — Ды і пасярод тыдня прыехаць і адразу пасяліцца можа не атрымацца.

### «Ёлкі-палкі» — нядорага і годна

У Быхаўскім раёне з'яўляюцца цэлыя аграэкавёскі. Напрыклад, у Грудзічыне, дзе сёння ёсць вялікая сядзіба «Пясчаны бераг», з 10 мясцовых жыхароў 4 зарэгістраваны ў справе экатурызму. Вяскоўцы забяспечваюць турыстаў натуральнымі харчамі, якія вырабляюцца ў іх уласных гаспадарках.

У Чыгірынскага вадасховішча ў вёсцы Кароткія на замежныя інвестыцыі мяркуецца

**Віталь Шышоў.** — Каб не было ў аднаго густа, а ў другога — пуста. І нам трэба абавязкова абменьвацца вопытам, ведамі. Зносіны вельмі важныя ў бізнэсе.

Яшчэ і года не мінула з моманту адкрыцця справы Віталя Сяргеевіча. Яго ніша — прыдарожны сэрвіс. У вёсцы Вараніно, каля запраўначнай станцыі на аўтатрасе «Санкт-Пецярбург — Адэса» месціцца яго сядзіба. Назву для яе дапамагла прыдумаць Тацццяна Дрыбінская:

— **«Ёлкі-Палкі»** — гэта знаёмы брэнд для расіян, якія тут часта спыняюцца. А з іншага боку, мае гістарычны кантэкст. У старадаўнія часіны над карчмой вывешвалі яловыя лапкі: на знак таго, што ў гэтым месцы можна адпачыць, паесці і выпіць. Потым яны высыхалі і заставаліся вісець палкамі.

У быхаўскіх «Ёлках-Палках» смачна накормяць. Гатуе для гасцей жонка Шышова, а ідзі падае дачка, студэнтка Магілёўскага ўніверсітэта харчавання. Сям'і дапамагаюць некалькі суседзяў, якія сталі індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

— Мы імкнёмся, каб усё было дастойна, — гаворыць Віталь Шышоў. — Так, каб госці сказалі, што Беларусь — гэта прыемнае месца.

У вялікім доме з натуральнага дрэва, але ўзведзенага па-сучаснаму, можна з камфортам спыніцца. Нумар на тры месцы будзе каштаваць за суткі 200 тысяч рублёў, харчаванне на чалавека абыдзецца на дзень у 70-80 тысяч рублёў.




Прыехалі ў «Ёлкі-Палкі».

### Закутак, каб схавацца ад горада

Нягледзячы на тое, што «Ёлкі-Палкі» месціцца пры аўтатрасе, госці могуць пагуляць паблізу ў дубовым гаі, праехаць на веласіпедах да Дняпра. Аднак яшчэ больш дапаможа, лічыць гаспадар, «зялёны» маршрут, які ў тым ліку і зоймецца грамадская рада па развіцці аграэкатурызму.

— Гэта будзе своеасаблівы брэнд Быхаўскага раёна, — расказала Тацццяна Дрыбінская. — Маршрут называецца **«Быхаўскія закуткі».** У гэтых закутках людзі змогуць схавацца ад цывілізацыі, адпачыць ад вялікіх гарадоў.

Турысты маюць розныя характары: адным трэба спакойна сядзець на адным месцы, іншым хочацца руху і новых уражанняў. Вось для апошніх у Быхаўскім раёне можна па «зялёным» маршруце пайсці пешшу, паехаць

на веласіпедах альбо пайсці ў паход на байдарках па Дняпры. І ўсё гэта — ад адной аграэкасядзібы да другой, па гістарычных помніках і прыгожых мясцінах. Адна ўмова — дабірацца трэба без матораў, у гэтым сэнс «зялёнага маршруту».

**«Гасцінны двор»**, што ў вёсцы Залахвенне, — вядомае месца для аматараў палявання і рыбалкі. Гэтая сядзіба адрозніваецца ад іншых рарытэтнымі аўтамабілямі, вялікай калекцыяй каменных ільвоў (адзін нават у фурманку запрэжаны), жывым і вельмі ласкавым (нягледзячы на грозны выгляд) сабакам Кімам і блізкасцю да Дняпра. На вадзе можна і ў альтанцы адпачнуць, а можна і на маторцы махнуць на экскурсію.

**Гаспадар Міхаіл Дудзікаў** таксама паклапаціўся пра «зялёны» маршрут.

— Аднойчы прыехалі госці з Казахстана, Малдовы, Украіны, якіх хацелася здзівіць, — расказаў Міхаіл Уладзіміравіч. — Побач з намі рака Лахва ўпадае ў Днепр. Мы падняліся па рацэ і сплавіліся на лодках без матораў. Ехалі да месца пагрузкі на аўтамабілях 15 хвілін, а па вадзе назад дабіраліся суткі. Рака пакручастая, прыгожыя краявіды навокал. Так што «зялёныя» маршруты — вельмі добрая ідэя.

Міхаіл Дудзікаў — таксама ўдзельнік раённай грамадскай рады па развіцці аграэкатурызму. Ён спадзяецца, што яна ўтворана не проста для таго, каб разам бавіць час, а каб з уладамі і іншымі раённымі ўстановамі вырашаць розныя праблемы. Якраз для стварэння «зялёных» маршрутаў цяпер патрабуецца падтрымка музеяў і лясных гаспадарак. «Давайце будзем працаваць актыўна!» — заклікаюць гаспадары.



«Гасцінны двор» у Залахвенні адметны каменнымі львамі.

Цяпер у цёплы сезон раён прымае штомесяц больш за 4 тысячы турыстаў, прычым да 500 з іх — замежнікі. Госці з Расіі, Украіны, Прыбалтыкі і нават еўрапейскіх краін даведваюцца пра Быхаўшчыну праз інтэрнэт, некаторыя гаспадары наладзілі стасункі з турыстычнымі фірмамі.

— Гэтым летам, каб пасяліцца на аграэкасядзібе на

пабудаваць спа-цэнтр, і ўжо некалькі чалавек з вёскі плануюць пачаць дзейнасць у галіне экатурызму.

Якраз **кластарная мадэль** павінна дапамагчы найперш новым гаспадарам, якія яшчэ не разгарнулі шырокія рэкламныя кампаніі.

— Аграсядзібы не павінны быць разрозненыя, — лічыць **старшыня грамадскай рады**

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота аўтара.**

## Факт

### ЗАДАВАЛЬНЕННЕ ПА ЗНІЖКАХ

**УП «Гарадскія паркі Мінскзялёнбуда» з 1 жніўня гэтага года прапаноўвае зніжкі ў памеры 25 працэнтаў дзецям са шматдзетных сем'яў пры наведванні дзіцячых атракцыёнаў прадпрыемства ў трох парках горада.**

У прыватнасці, зніжкі будуць дзейнічаць у парках імя М. Горкага, Чалюскінцаў і 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. Памеры зніжак на кожны атракцыён розныя. Умовы іх прадастаўлення можна ўдакладніць на сайце прадпрыемства або ў касах паркаў.

**БЕЛТА.**

### СЯСТРА НА СЯСТРУ

Дзяўчына са Столінскага раёна падазраецца ў забойстве старэйшай сястры. Тую знайшлі ў двары дома вёскі Адверхычы: 27-гадовая жанчына сканала ад нажавога ранення ў жывот. Як мяркуе следства, сварка паміж сёстрамі ўзнікла на падставе рэўнасці. Такім вось дзікунскім чынам 22-гадовая пазбавілася ад саперніцы. А таксама ад волі, сумлення і далейшай долі нармальнага чалавека.

**Яна СВЕТАВА.**

### РАНЕЙ «ВІСКУЛІ» НЕ БАЧЫЛІ ТАКОГА ЗВАРШЧЫКА

Госць Пружан, 37-гадовы зваршчык з Гродна, наведаў у райцэнтры бар са знакавай назвай «Віскулі». А калі цела атрымала пэўную дозу алкаголю, душа, відаць, запатрабавала тэрміновага выкіду адрэналіну. І зваршчык пайшоў «у атаку» на сам бар. Спачатку замахнуўся і запусціў бутэлькай у вітрыну з напоямі, затым перавярнуў касавы апарат і барную стойку з падносамі і стравамі. Зламысніка затрымалі. Папярэдні ўрон, нанесены прадпрыемству грамадскага харчавання, ацэнены ў 600 000 рублёў.

**Яна СВЕТАВА.**

### З КАЎШОМ ПА ЖЫЦЦІ

Студэнты 4-га курса Мазырскага педагагічнага ўніверсітэта, жыхары вёскі Конкавічы, што ў Петрыкаўскім раёне, знайшлі магчымасць лёгкага летняга падзаробку. Тры маладыя чалавекі выкралі коўш ад экскаватара коштам амаль Br5 млн рублёў, калі машына знаходзілася на беразе меліярацыйнага канала.

### ЦУКАР НАЛЕВА?

Два аўтамабілі «Мерседэс-бэнц Спрынтар» пад кіраваннем мазыран затрыманы ля вёскі Казялужжа Хойніцкага раёна. Абодва былі загружаны цукрам у вялікіх папяровых і палімерных мяшках. Як высветлілася, грамадзянам салодкі прадукт вагой 12380 кг быў адпушчаны са склада гандлёвай базы Хойніцкага райпа на агульную суму больш чым Br61 млн рублёў. Пры гэтым на цукар былі складзены адпаведныя таварна-транспартныя накладныя, паводле якіх прадукт адпушчаны для рэалізацыі ў крамах Хойніцкага райпа. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, праводзіцца праверка па гэтым факце, а мерапрыемствы, накіраваныя на абарону спажывецкага рынку, працягваюцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### НЯЎЖО ТАК ХАЦЕЎ ЕСЦІ?

Не паспела 36-гадовая жыхарка Кобрына як след адлучыцца з дому, як зламыснік выбіў дзверы ў кватэру. Скраў, праўда, толькі прадукты харчавання і вуду. Міліцыяй неўзабаве быў устаноўлены ўзломшчык, ім аказаўся равеснік гаспадыні, сусед па доме, рабочы аднаго з ААТ Кобрына.

**Яна СВЕТАВА.**

## Ну і ну!

### Дзяўчына і машыны

Адразу два ўладальнікі аўто, у тым ліку жанчына, у Віцебску паведамілі ў міліцыю пра тое, што ноччу нехта пашкодзіў іх аўтамабілі, якія стаялі ў двары дома на вуліцы Лазо. Аказалася, што такім чынам хуліганіла 19-гадовая дзяўчына, мясцовая жыхарка, беспрацоўная. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### Вулічную відэакамеру з фасада

будынка ў Гомелі, дзе размешчана таварыства з абмежаванай адказнасцю, выкраў невядомы а палове пятай раніцы. Іншаму зламысніку тэрмінова спатрэбіліся 11 свяцільняў. Іх ён выкраў днём з аднаго пад'езда дома ў Мазыры. Між іншым, праз паўгода міліцыя знайшла жыхарку Гомеля, якая ў снежні летась у спецыялізаванай краме бясплатна апранулася ў паліто з норкі. На наступную зіму каштоўная вопратка ёй дакладна не спатрэбіцца, бо маладая жанчына, раней судзімая за крадзеж, арыштавана знsocу і чакае суда па некалькіх прыгодах з крымінальным ухілам.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### САВЕТ БЯСПЕКІ ААН ЗБІРАЕЦЦА НА ЭКСТРАННУЮ НАРАДУ ПА СІРЫІ



**Міжнародная супольнасць склікае экстраннае пасяджэнне Савета бяспекі ААН па Сірыі, дзе 31 ліпеня падчас штурму горада Хама загінула больш за 100 чалавек.**

З прапановай правесці кансультацыі выступіла ўвечары 31 ліпеня Германія, якая з'яўляецца непастаянным чальцом Савета. Раней міністр замежных спраў Італіі Франка Фраціні пасля нядзельных падзей у сірыйскім горадзе Хама запатрабаваў экстраннага склікання Савета бяспекі ААН для таго, каб выпрацаваць цвёрдую пазіцыю ў дачыненні ўрада Сірыі.

Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун у чарговы раз асудзіў выкарыстанне сілы супраць грамадзянскага насельніцтва ў Сірыі. У распаўсюджанай у штаб-кватэры ААН заяве яго афіцыйнага прадстаўніка гаворыцца, што генеральны сакратар глыбока заклапочаны паведамленнямі з Сірыі пра тое, што ў горадзе Хама былі забітыя і паранены сотні ўдзельнікаў акцый пратэсту.

Апошнія месяцы ў Сірыі праходзяць масавыя акцыі пратэсту. Апазіцыя патрабуе правядзення кардынальных рэформаў і адстаўкі прэзідэнта Башара Асада. 31 ліпеня ў сірыйскім горадзе Хама адбыўся танкавы штурм. Баі ў гэты дзень сталі самымі маштабнымі з моманту пачатку антыўрадавых выступленняў у Сірыі. Падчас спецаперацыі ўрадавых войскаў супраць узброенай апазіцыі загінула больш за 100 чалавек.

Паводле інфармацыі афіцыйнага Дамаска, вайскоўцы вядуць барацьбу з «узброенымі групамі баевікоў, якія тэрарызуюць насельніцтва ў горадзе Хама».

### ЗША ПАЗБЕГЛІ ДЭФОЛТУ

**Прэзідэнт ЗША Барак Абама заявіў, што яго адміністрацыя змагла дамовіцца з дэмакратамі і рэспубліканцамі пра ўзняцце планкі дзярждоўгу, паведамляюць інфармагенцтвы. Паводле яго слоў, лідары дзвюх партый у абедзвюх палатах дасягнулі дамовы, якая дазволіць скараціць бюджэтны дэфіцыт і пазбегнуць дэфолту.**

Дамова прадугледжвае скарачэнне дзяржаўных выдаткаў на суму ў $1 трлн на працягу найбліжэйшых дзесяці гадоў. У выніку выдаткі на ўнутраныя праграмы будуць даведзены да самага нізкага ўзроўню з часоў Дуайта Эйзенхаўэра. Тым не менш, паводле слоў Барака Абамы, гэтага ўзроўню дастаткова для таго, каб урад ЗША працягваў ствараць новыя працоўныя месцы, інвестуючы ў такія галіны, як адукацыя і навуковыя даследаванні.

Кіраўнік ЗША прызнаў, што дасягнутая дамова не з'яўляецца ідэальнай. «Аднак самае галоўнае тое, што яна дазваляе пазбегнуць дэфолту, — падкрэсліў ён. — Яна гарантуе, што мы не сутыкнёмся з такога кшталту крызісам праз шэсць, восем ці дванаццаць месяцаў».

### ТЫСЯЧЫ ПАСАЖЫРАЎ НЕ МОГУЦЬ ВЫЛЕЦЕЦЬ З УКРАІНЫ

**Ва Украіне пратэстуюць пілоты кіеўскай авіякампаніі «Аэрасвіт», у выніку чаго больш за тысячу пасажыраў не могуць вылецець з міжнародных аэрапортаў «Барыспаль», «Данецк» і «Сімферопаль». Лётчыкі выступаюць супраць скарачэння заработнай платы.**

У прыватнасці, у «Барыспалі» затрымана больш за пяць рэйсаў самалётаў Boeing-737 у Маскву, Гамбург, Адэсу, Дзюсельдорф, Афіны і іншыя гарады. У данецкім аэрапорце затрымана восем рэйсаў.

Пілоты патрабуюць індэксацыі выплат за перыяд фінансавага крызісу 2008-2009 гадоў, а таксама ажыццяўляць аплату працы па новым палажэнні, якое павялічвае іх памер на 18%.

# МІНЧАНАМ ПАШЧАСЦІЛА,

## альбо Кіно трэба адчуваць скурай



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Апошнія тыдні ў народзе пачалі хадзіць чуткі пра тое, што мінскі кінапракат здае пазіцыі. Маўляў, толькі 6 прэм'ер у чэрвені. Столькі ж у ліпені. Крызіс перамог прадпрыемства УП «Кінавідэапракат» Мінгарвыканкама? Не, сцвярджае генеральны дырэктар Васіль КОКТЫШ. Вось у верасні, напрыклад, у Мінску адбудзецца адразу 16 кінапрэм'ер. Чаму ж улетку ў кінажыцці сталіцы — зацішша?**

**Пра гэта, а яшчэ пра тое, колькі сёння каштуе мінская кінатэатральная сетка, што калісьці ў мінскія кінатэатры прыходзілі пагрэцца і выпіць гарэлкі, што за 4D-кіно хутка можна будзе паглядзець у Мінску і што чуваць пра абласныя кінапракаты, распавядае Васіль Пятровіч.**

**Наогул, Васіль Коктыш — цікавы чалавек. Выдатна ведае гісторыю беларускага кінапракату і адчувае сябе ў кінапрамысловасці як рыба ў вадзе. Ён любіць гаварыць: «Сапраўдны кінапракатчык кіно адчувае скурай. Мінчанам пашчасціла. Я якраз у ліку такіх людзей». І гэта зусім не камплімент сабе любімаму. Васіль Пятровіч заўжды амаль на 100% дакладна прадказвае, якія фільмы выклічуць попыт у гледача, а якія застануцца незаўважанымі; якія фільмы збяруць больш грошай, а якія больш душэўныя і якасныя. Таму яго прадпрыемства развіваецца сапраўды зайздроснымі тэмпамі. І сёння, як сцвярджае сам Васіль Пятровіч, мінскі кінапракат знаходзіцца у Сусветнай Лізе кінапракатных арганізацый. Мінску адначасова з усім светам даступны бадай усе прэм'еры сезона.**

### Недарагое задавальненне

— У ліпені па колькасці наведванняў мы наблізіліся да савецкага перыяду, калі было 2-3 тэлеканалы, па якіх не паказвалі новыя фільмы, не было DVD, не было інтэрнэту і ўсе хадзілі ў кіно. Сёлета ліпень па колькасці наведванняў абганіць нават студзень — самы папулярны месяц для паходаў у кіно. У савецкі перыяд у Мінску было 12 млн гледачоў за год. У мінулым годзе ў нас было 4,5 мільёна за год. Сёлета ўжо 2,5 за паўгоддзе плюс 600 тысяч за ліпень. Мы выходзім за гэты год як мінімум на 5 млн гледачоў. Калі забяспечыць тэмпы развіцця, якія мы дасюль трымалі, дасягнуць 15 мільёнаў гледачоў цалкам рэальна.

Сярэдні кошт квітка ў кіно ў краінах СНД — 7,1 долара. Кошт і ў нас супадае. Толькі не ў доларах, а ў беларускіх рублях. 7160 руб — сярэдні кошт квітка ў мінскія кінатэатры. Гэта з улікам спецыяльных дзіцячых сеансаў па 1000 і 1500 руб. У Маскве сярэдні кошт, напэўна, больш за 10 долараў. Пры ўсіх гэтых эканамічных паказчыках і нізкім кошце квіткоў нас прынялі ў Вышэйшую лігу кінапракату. Па цэнах нам задаюць пытанні, але мы не збіраемся заганяць гледача ў кут коштам квітка. Я лічу, што кіно павінна быць даступнае для ўсіх. У тым ліку і для дзяцей. Сёння першыя месцы займае мультыплікацыя: «Шрэк», «Рыа», «Кунг-фу панда», «Шчаўкунок і Пацучыны кароль» і інш. На такую анімацыю сёння ходзяць сем'ямі і не па дзіцячых квітках. Калі ў Германіі ў кіно ідзе сям'я з 10 чалавек і там квіток каштуе 8 еўра, то яны плацяць 80 еўра. У нас тое самае, таму што праваўладальнікі нам не дазволяць анімацыйныя блокбастары паказваць па нізкіх цэнах.

Ніводная краіна не можа паказаць УСЕ прэм'еры. Краіны аб'яднанай Еўропы ў год выпускаюць каля 800 фільмаў, і 900 фільмаў выпускае Галівуд. Плюс фільмы расійскай вытворчасці. Гэта значыць, усе фільмы паказаць немагчыма — не хопіць экранаў. Калі б было ў нас 2000 экранаў, тады мы маглі б паказаць 2000 прэм'ер. Экранаў у нас менш, чым у той жа Маскве, мы вымушаны з добрых фільмаў выбіраць найлепшыя. А гэта таксама дасягненне.

Мінскі кінапракат прывязаны да расійскага рынку, гэта натуральна. Мы можам купляць фільмы наўпрост у Лондане. Але кошт будзе якасна адрозніваца, і прэм'ер будзе менш. У Расіі мы купляем не самі фільмы, а правы паказу. Фільмы нам даюць бясплатна. З Расіі мы атрымліваем іх адразу дубляваныя, тыражаваныя. Заказваем неабходную колькасцю копій. Калі б мы заказвалі ў Лондане, пра сусветныя прэм'еры можна было б забыць. Трэба было б плаціць за дубляванне і тыражаванне. Таму нам вельмі выгадна і зручна працаваць адначасова з расійскім рынкам і набываць у іх цалкам гатовыя для паказу карціны.

У нашых планах на гэты год было адкрыццё яшчэ трох 3D-кінатэатраў: «Бярэсце», «Мір», «Аўрора». Але з-за крызісу давялося адкарэктаваць свае планы, сёння мы спыняемся толькі на «Бярэсці». Рамонт «Кастрычніка» адкладаецца як мінімум да 2013 года.

Насамрэч прывесці кінатэатр у належны стан вельмі складана і дорага. Тут трэба думаць і пра тэхнічнае аснашчэнне, і пра камфортныя ўмовы для гледачоў. У «Бярэсці» ўжо ёсць 3D-абсталяванне. І гэта нам абышлося ў 370 мільёнаў бел. руб.

### «Мы адны з нямногіх, хто мые акуляры пасля кожнага сеанса»

— Да 4D-фільма «Дзеці шпіёнаў», які хутка з'явіцца ў нашым пракаце, мы паставіліся насцярожана, ведаючы нашага патрабавальнага гледача. Элемент 4D там у тым, што кожнаму гледачу перад паказам фільма будуць даваць спецыяльную картку (пласцінку), пры дапамозе якой падчас прагляду можна будзе адчуваць розныя пахі. Мы самі іх яшчэ не бачылі, атрымаем разам з фільмамі. Але нас запэўнілі, што ўсе сертыфікаты міжнародныя на гэта ёсць, ніякай алергічнай рэакцыі быць не можа. Мы заказалі 10 тысяч картак. Нам фільм проста не давалі без гэтых картак. Сказалі: «Слухайце, ну вы што! Вы астравіцяне нейкія ці хто?» Проста ніхто такіх пытанняў не задае. Да таго ж у пачатку фільма тлумачаць, як карыстацца гэтымі карткамі. А калі ў нас іх не будзе, то ў гледачоў узнікне пытанне: чым карыстацца?

Мы адны з нямногіх, хто мые акуляры пасля кожнага сеанса 3D. Гэта не так ужо і танна, і страта часу. І таму ў нас паміж сеансамі 3D большыя перапынкі. У ЗША 3D-акуляры проста праціраюць сурвэткамі. Але мы ад граху падалей... Не дай Бог у некага кан'юнктывіт утворыцца, і яны абвінавацяць нас.

### «Мы маглі б быць адной камандай»

— Вельмі хочацца, каб рэгіёны развіваліся гэтак жа, як развіваецца Мінск. У мяне яшчэ «дзяржкіношнае» мысленне і я вельмі балюча перажываў развал беларускага кінапракату пасля развалу СССР. Дарэчы, у 1997 годзе Мінск быў на апошнім месцы сярод усіх гарадоў Беларусі па якасці матэрыяльна-тэхнічнай базы кінатэатраў. У савецкія часы было шмат неабгрунтаваных дзеянняў у сферы кінапракату. У 1956 годзе аб'ядналі Міністэрства па кінематаграфіі з Міністэрствам культуры. У 1963 годзе, калі развалілі ўсю матэрыяльна-тэхнічную базу, спахапіліся: а што ж мы нарабілі! Тады стварылі Камітэт па кінематаграфіі. Сёння ўзровень развіцця ў рэгіёнах розны. Мы маглі б быць адной камандай і нават адной кінатэатральнай сеткай. Але пра гэта нават не ідзе гаворка, таму што ў нас абсалютна розныя падыходы. Калі Мінск будзе чакаць рэгіёны, то можа спазніцца з пераходам на «лічбу». Для параўнання: у савецкі час удзельная вага даходаў Мінска ад продажу квіткоў у кіно была прыблізна 17%. Сёння 60%. Мы, вядома, з абласнымі кінапракатамі добра камунікуем, падтрымліваем. Але я нават не магу адказаць, ці ўсе пачалі паказ новага «Гары Потэра». Таму што мы атрымліваем фільмы бясплатна, а яны павінны спачатку зрабіць перадаплату.

### Калі нас адвучылі ад (беларускага) кіно?

— Нядрэнна было б, каб у мінскія кінатэатры прыйшлі інвестары. Але, на жаль, сур'ёзных інвестараў не відаць. Па кавалках раздаць кінатэатры я не хачу. Будзе татальная «Рубін плаза». Я не кажу, што «Рубін плаза» дрэнна. Няхай гледачы вызначаюць. Але па кошце яны ўжо ўбачылі розніцу... Калі па кавалках расхапаюць кінатэатры — гледачу будзе дрэнна. Кіно стане недасяжнае. Выбар будзе — што дадуць, тое і пакажуць. Калі «Уорнэр бразэрс» пракатваюць 20 фільмаў, то вы будзеце ў Мінску і паказваць іх 20 фільмаў, інакш яны вам ніводнага не дадуць. Самастойнасці ў выбары фільмаў, якую мы маем сёння, у нас не будзе.

У 1997 годзе ўсе кінатэатры Мінска былі ў прыватнай уласнасці. Што было? Пустыя залы — іх здавалі ў арэнду, каб зарабіць хоць якія грошы. У кіно прыходзілі проста пагрэцца і папіць піва. Напэўна, тады і прывучылі нашых людзей несці ў кінатэатры абеды, піва, гарэлку... Тады гледачоў было 700 тысяч у год, з іх больш за 60% дзяцей, якіх проста сілай зганялі ў кіно. Тады (дзе-нідзе і сёння ў рэгіёнах такое сустракаецца) дзяцей арганізавана з дзіцячага садка, школы валаклі глядзець беларускае кіно. А потым яны студэнтамі прыязджаюць у Мінск і на беларускае кіно не ідуць. Можа, яно і не такое дрэннае, але таму, што іх з дзяцінства прывучылі, што на беларускае кіно абавязкова вядуць строем, выпрацавалася непрыманне яго. Сёння даходаў ад тых, хто купіў квіток па дзіцячым кошце, у Мінску 0,8%.

Мы гатовыя і да акцыянавання, і да прыватызацыі. Але для гэтага патрэбны вялікія грошы. Балансавы кошт асноўных фондаў прадпрыемства — 120 мільярдаў бел. руб. Каб прыватызаваць, памножце гэтую лічбу на тры ці хоць бы на два, калі будзе сур'ёзны інвестар, гатовы ўкласці яшчэ ў два-тры разы больш, чым тое, за што ён купіць. Мы рады інвестару, які прыйдзе ў «Ракету» і «Дружбу». Але нам не трэба інвестар у «Беларусь» і «Кіеў», якія мы ўжо давялі да ладу.

### Кіно будзе

*Сёння кіно — гэта бізнэс. І атракцыён. Цікава, што менавіта ў XXI стагоддзі, калі тэхнічныя магчымасці дазваляюць рабіць у кіно абсалютна ўсё, дазваляюць абсалютную свабоду творчасці і палёт фантазіі, кіно з высокага мастацтва (якім было ў часы свайго росквіту 1970-1990-я гг.) ператвараецца зноў проста ў экстрэмальную забаўлянку, якім было ў часы кінематографа братоў Люм'ер. Вядома, што кантэнт кінатэатраў падначальваецца мэйнстрыму. Таму сярод навінак, якія мінчукі змогуць паглядзець восенню, шмат чарговых блокбастараў і іншых фільмаў, якія ствараюцца толькі для таго, каб сабраць касу. Васіль Коктыш любіць паўтараць, што ёсць фільмы, якія можна круціць месяц (кшталту «Гары Потэра»), а ёсць фільмы, з якімі пасля тыдня пракату ўжо няма чаго рабіць — залы будуць пустыя. Тым не менш, восенню інтэлектуальнага ўдумлівага гледача мінскі кінапракат таксама парадуе. Будзе і скандальная «Меланхолія» Ларса фон Трыера, і расійскі «Без мужчын» з Надзеяй і Ганнай Міхалковымі, і «Ноч у Парыжы» Вудзі Алена з Карлай Бруні ў эпізадычнай ролі, і «Высоцкі, дзякуй, што жывы» рэжысёра Пятра Буслава, сцэнарый да якога напісаў сын Высоцкага Мікіта.*

*Адным словам, кіно будзе. Трымайцеся добрага густу і не паддавайцеся на правакацыі.*

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

Муз-news

# НА «НОВАЙ ХВАЛІ-2011» ПЕРАМОГ...

## ДОКТАР ЮРЫДЫЧНЫХ НАВУК З ЗША

**«НОВАЯ хваля-2011» раздала «сланоў». На жаль, беларускаму канкурсанту Юзары не ўдалося заваяваць журы сваёй харызмай, і ён замкнуў другую пяцёрку — пасля трох конкурсных дзён спявак набраў 318 балаў і заняў 10 месца. Такім чынам, лепшым вынікам выступлення беларусаў на «Новай хвалі» застаецца 4-е месца Паліны Смолавай, якое спявачка здабыла ў 2007 годзе.**

### ХТО ПЕРАМОГ?

Першае месца і грашовы прыз у 50 тысяч еўра атрымаў **амерыканец Джэйдан Фелдар.** Спявак родам з Нью-Ёрка, там ён скончыў юрыдычны каледж і нават атрымаў ступень доктара (!) юрыдычных навук. Нягледзячы на сур'ёзнае захапленне юрыспрудэнцыяй, спяваць Джэйдан пачаў яшчэ ў тры гады: яго талент заўважыў стрыечны брат, які кіраваў царкоўным хорам.




Каментуючы свой удзел у конкурсе, спявак прызнаецца, што гэта першы яго вакальны конкурс у Еўропе.

— Я праслухаў тысячы песень і выбраў для ўдзелу тыя, якія кранулі мяне найбольш. У мяне няма вялікай групы падтрымкі, уся мая сям'я і сябры засталіся ў ЗША. Але тут мяне падтрымлівала мая дзяўчына, а яе прысутнасць была для мяне нашмат важнейшай за самую вялікую групу падтрымкі.

Другое месца і 30 тысяч еўра прысудзілі **украінцы Машы Сабко.** Пераможцы ўкраінскага тэлепраекта «Украіна вачам не верыць» не хапіла толькі аднаго бала, каб «дагнаць» амерыканца Фелдара. За плячыма спявачкі два фіналы тэлепраектаў «Шанц-8» і «Шанц-10» на ўкраінскім тэлебачанні і фінал адбору на «Еўрабачанне»: у 2010 годзе Маша падзяліла першае месца са спявачкай Алёшай.

Трэцюю прыступку заняў **расійскі гурт «Н.А.О.М.І.»,** якія атрымалі ў якасці прыза чэк на 20 тысяч еўра. Біяграфіі салістак «Н.А.О.М.І.» уражваюць сваёй шматстайнасцю. Адна з дзяўчын з чырвоным дыпломам скончыла Расійскую акадэмію тэатральнага мастацтва, другая — выпускніца Акадэміі Правасуддзя, трэцяя — удзельніца праекта «Народны артыст-1» і паўфіналістка расійскага адбору на «Еўрабачанне».

Прыз глядацкіх сімпатый дастаўся спеваку Эрыка з Арменіі. Гурт з Фінляндыі «Flute of Shame» атрымаў адразу дзве ўзнагароды: спецпрыз ад гарадской думы Юрмалы і прыз ад Алы Пугачовой — «Зорку Алы» і 50 тысяч долараў.

### ДА СУСТРЭЧЫ ПРАЗ МЕСЯЦ

Ужо па традыцыі адгалоскам дарослага конкурсу становіцца дзіцячы варыянт «Новай хвалі», які сёлета пройдзе 20-22 жніўня ў Артэку. На конкурс прыедзе 15 юных артыстаў з Расіі, Украіны, Чэхіі, Швецыі, Балгарыі, Германіі, Арменіі, Італіі, Расіі, Латвіі і Казахстана. Беларусь на конкурсе прадставіць 11-гадовая Алена Гразнова.

Ці ўдасца нашай суайчынніцы заявіць пра сябе, пакажа час. Аднак поспех беларускі Крысціны Святлічнай, якая ў 2008 годзе перамагла на дзіцячай «Новай хвалі», дае Алене стымул змагацца за перамогу. Наперад, Беларусь!

**Ілья ЛАПАТО.**

### Свабодныя зямельныя ўчасткі ў Заводскім раёне сталіцы выставяць на аўкцыён

**Свабодныя зямельныя ўчасткі, размешчаныя ў Заводскім раёне, выставяць на аўкцыён для продажу ў прыватную ўласнасць, паведамілі ў раённай адміністрацыі.**

Паводле слоў спецыялістаў, пакуль на таргі плануецца выставіць пяць пляцовак, якія размешчаны на вуліцах Іркуцкай, Фучыка і Фядотава. Гэта зямельныя ўчасткі, якія засталіся незабудаванымі яшчэ з 50—60-х гадоў мінулага стагоддзя.

Плошча надзелаў складае ад 5 да 6 сотак. Магчымасць купіць участкі будзе давацца толькі грамадзянам Рэспублікі Беларусь. Мэта набыцця — будаўніцтва аднакватэрных або блакіраваных жылых дамоў.

Як удакладнілі ў Мінскім гарадскім цэнтры нерухомасці, аўкцыёны па продажы ўчасткаў пройдуць у сталіцы 8 жніўня.

**Наталля ВАВІЛАВА,**
*«Мінск—Навіны».*

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ А/м «Форд Эскорт» 1994 г.в., хэчбэк, 1,4, расход бензіну 5,5, стан добры, 2200 у.а.
Тэл. МТС 764 42 91.

❒ Козы, пяцімесячныя казлы, козачкі, казінае малако. Мінская вобл., Смалявіцкі р-н, Жодзінскі с/с.
Тэл. 8 017 76 600023.

❒ Трактар ЮМЗ і з/часткі.
Тэл. 613 47 19, 673 91 38.

А/м «Шкода Феліцыя» 1996 г.в., комбі-універсал, 1,9 дызель.
Тэл. 8 029 271 10 35.

❒ Кватэра ў в. Цяцеркі 20 км ад Браслава, пліты ж/б 2 шт. (1,9x5,8), карова (выбар з 4 галоў).
Тэл. 8 02153 26018.

❒ Каляска інвалідная прагулачная.
Тэл. 8 044 530 54 74.

❒ Дом пад знос у Клецкім раёне 6,7x7,8 м, дрэва ў выдатным стане.
Тэл. 8 033 636 04 67.

❒ Катэдж (незавершаны, гатоўнасць 76%), маскоўскі напрамак, пас. Калодзішчы, 14 сотак, вада, газ, ёсць ТУ.
Тэл. 8 017 208 26 13, 8 029 642 53 22.

❒ А/м «Фальксваген Джэта», зялёны седан, 1989 г.в., 1,6 дызель, 230 тыс. км, 5/100 км, гідраўзмацняльнік, сігналізацыя, добры стан. Мінск. 2300 у.а.
Тэл. 8 029 356 22 19.


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

**Заказчик-Застройщик – ОАО «Минскпромстрой».**

Зарегистрировано Минским горисполкомом, решение № 698 от 20 июня 2000 года в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100064639.

Лицензия № 02250/0627487, выдана Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь и действительна до 15 марта 2014 года.

**Адрес: 220034, г. Минск, пер. Войсковой, 12.**

Режим работы: понедельник – четверг 9.00 – 17.45 (обед 13.00 – 14.00), пятница 9.00 – 16.45 (обед 13.00 – 14.00), выходной – суббота, воскресенье.

Выполняя функции Заказчика, в течение последних трех лет ОАО «Минскпромстрой» построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом № 8 по ул. Тимошенко;
- жилые дома №№ 16, 20 по ул. Бурдейного;
- жилые дома №№ 89; 91; 73; 75 по ул. Притыцкого;
- жилой дом № 36 по ул. Чечота.

**Цель проекта** – Строительство объекта «Многоэтажный жилой дом № 35 (по генплану), в микрорайоне «Дружба-1» по пр. Дзержинского» общей площадью 46 046,88 кв.м., в том числе общая площадь квартир – 39 238,74 кв.м.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

**Начало строительства объекта** – IV квартал 2009 года.

**Окончание строительства:** секции №№10-11 – декабрь 2011г., секции №№12-13 – март 2012 г.

**Месторасположение объекта** – Московский район г. Минска микрорайон «Дружба-1», вблизи проектируемой станции метро, через пр. Дзержинского гипермаркет «Простор».

***Жилой дом запроектирован:*** 6-7-8-9-14 этажей, 13 подъездов, 16 лифтов, всего квартир – 487, из них: 1-комнатных – 65шт., 2-комнатных – 195 шт., трехкомнатных – 219 шт., четырехкомнатных – 8 шт. На первом этаже – служебное помещение Товарищества собственников.

**Гостевые парковки** предусматриваются вдоль проезда и на дворовой территории. Парковочные места автотранспорта планируются в коммунальной зоне микрорайона. Благоустройство внутридворовой территории предусматривает игровое оборудование для детей, пешеходные дорожки, озеленение.

**В состав общего имущества объекта входят:** лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, кровля, технические и подвальные этажи, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механические, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры (в т.ч. внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения дома), озеленения и благоустройства, помещение Товарищества собственников, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

**Конструкция здания** – монолитный железобетонный каркас с плоскими монолитными перекрытиями с переменной сеткой колонн. Наружные стены – кирпич поризованный с утеплением. Окна (за исключением лоджий) – ПВХ-профиль с двухкамерным стеклопакетом.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 11.02.2009 г. №329-5/09. Получены положительные заключения КАиГ 08.10.2008 г. №10-08/146М, Минского городского комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды от 21.10.2008 г. № 02-6/2184.

Получено разрешение Госстройнадзора №2-203Ж-046/09 от 17.09.2009 г. на производство строительно-монтажных работ.

Участок площадью 4,1008 га передан ОАО «Минскпромстрой» на основании решения Мингорисполкома № 1107 (п. 10) от 21.05.2009 года для строительства объекта. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка и возникновения права на него от 02.07.2009 г. № 500/1054-856.

Заключение договоров создания Объекта долевого строительства проводится по неизменной, на период действия договора цене. На дату опубликования декларации и по 31 августа 2011 г., для юридических лиц и физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, к долевому строительству предлагаются 17 квартир общей площадью 1,2 тыс. м², расположенных с 1-го по 7 этажи, из них: однакомнатные квартиры общей площадью 51,05м² по цене 6,7 млн руб. за 1(один) кв. м. общей площади; двухкомнатные квартиры общей площадью 59,16 м² по цене 6,7 млн руб. за 1 (один) кв.м общей площади; трехкомнатные квартиры общей площадью 87,08 м² по цене 6,3 млн руб. за 1(один) кв. м общей площади и трехкомнатные квартиры общей площадью 96,8 и 99,49 м² по цене 6,2 млн руб. за 1 (один) кв. м общей площади.

Заказчиком-Застройщиком по строительству объекта выступает ОАО «Минскпромстрой». Функции генерального подрядчика исполняют филиалы ОАО «Минскпромстрой», выполняя при этом часть работ самостоятельно, а часть по субподрядным договорам со специализированными сторонними организациями.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: **г. Минск, пер. Войсковой, 12, каб. 312 или по телефонам 283 15 88; 283 15 78; Velcom (044) 787 12 68.**

**Генеральный директор В.С. Нехай**

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ЧЕТВЕРТОГО ВЫПУСКА ООО «Студенческий дом» (далее – Краткая информация)

*«УТВЕРЖДЕНО»*
*Общим собранием Участников*
*ООО «Студенческий дом»*
*Протокол № 22 от 15.07.2011 г.*

**г. Минск**

**1. Полное и сокращенное наименование Эмитента (на белорусском и русском языках)**

на белорусском языке:

полное: Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Студэнцкі дом»;

сокращенное: ТАА «Студэнцкі дом»;

на русском языке:

полное: Общество с ограниченной ответственностью «Студенческий дом»;

сокращенное: ООО «Студенческий дом».

**2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Республика Беларусь, 220040, г. Минск, ул. Восточная, 39, пом. 1Н, каб. №16, телефон: (017) 292-53-67, телефон/факс: (017) 292-53-67, e-mail: St-d@tut.by.

**3. Основные виды деятельности Эмитента**

Эмитент в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и своим уставом осуществляет следующие основные виды деятельности (в соответствии с общегосударственным классификатором «Виды экономической деятельности»):

74201 - Технический надзор в строительстве;

52630 - Розничная торговля;

93020 - Предоставление услуг парикмахерскими и салонами красоты;

70200 - Сдача помещений в аренду.

**4. Сумма зарегистрированного уставного фонда**

Уставный фонд Эмитента сформирован полностью в размере, предусмотренном Уставом: 7 802 000 (семь миллионов восемьсот две тысячи) белорусских рублей.

**5. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность Эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации**

Бухгалтерская отчетность по итогам работы Эмитента за 2011 год и последующие годы подлежит публикации не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года в газете «Белорусы и рынок».

**6. Место, время и способ ознакомления с Проспектом эмиссии Облигаций**

С более подробной информацией и Проспектом эмиссии Облигаций можно ознакомиться в течение срока размещения по адресу: Республики Беларусь, г. Минск, ул. Беломорская, 23, помещение 1Н, комната 1-1, ежедневно в рабочие дни (кроме субботы и воскресенья) с 10-00 до 13-00. Тел. 8 (017)-290-00-55. Ознакамливающееся лицо имеет право читать и делать выписки из предоставляемых в соответствии с настоящим пунктом документов.

**7. Дата, номер государственной регистрации Эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Общество с ограниченной ответственностью «Студенческий дом» (далее – эмитент) зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 07.09.2000 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100037170.

**8. Дата принятия решения о выпуске Облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решение о выпуске займа жилищных Облигаций принято Общим собранием участников ООО «Студенческий дом», Протокол № 22 от 15.07.2011 г.

**9. Форма выпуска и вид Облигаций, объем эмиссии, количество, серия, номера:**

| | |
|---|---|
| **Форма выпуска и вид Облигаций** | Жилищные, бездокументарные, именные, неконвертируемые |
| **Объем эмиссии** | 499 200 000 (четыреста девяносто девять миллионов двести тысяч) белорусских рублей |
| **Количество Облигаций** | 78 (семьдесят восемь) штук |
| **Серия, номера Облигаций** | СД-4, №№ 000001-000078 |

**10. Номинальная стоимость Облигаций**

Номинальная стоимость одной Облигации составляет 6 400 000 (шесть миллионов четыреста тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный 1 (одному) метру квадратному общей площади жилья в создаваемых объектах недвижимости в составе объекта строительства «Многоэтажные жилые дома (не относящиеся к домам повышенной комфортности) со встроенными помещениями общественного назначения и подземными гаражами-стоянками в районе жилой застройки в квартале ул. Комаровское кольцо - пер. Восточный - ул. Корш-Саблина - ул. Восточная в г. Минске», без учета отделочных работ.

Общий эквивалент номинальной стоимости Облигаций составляет 78 (семьдесят восемь) квадратных метров.

Эквивалент номинальной стоимости Облигаций не подлежит изменению в течение срока обращения Облигаций настоящего выпуска.

**11. Цель выпуска Облигаций**

Выпуск Облигаций осуществляется в целях финансирования затрат, связанных с созданием объекта строительства, указанного в п. 10 Краткой информации, в т.ч. в целях замещения средств, привлеченных (привлекаемых) для создания указанного объекта, а также обеспечения рентабельности Эмитента, связанной с реализацией помещений объекта, завершенного строительством.

В период строительства временно свободные денежные средства, полученные от продажи Облигаций, Эмитент вправе использовать на финансирование иных мероприятий, связанных со строительством указанного объекта строительства.

**12. Период проведения открытой продажи Облигаций**

Датой начала открытой продажи Облигаций является 3 августа 2011 года.

Датой окончания открытой продажи Облигаций является 20 декабря 2013 года.

**13. Место и время проведения открытой продажи Облигаций**

Размещение Облигаций осуществляется путем открытой продажи физическим и юридическим лицам – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь. До момента покупки Облигаций покупатели должны заключить с Эмитентом договор в простой письменной форме, предусматривающий обязательства Эмитента по строительству жилых помещений владельцам Облигаций.

Размещение Облигаций осуществляется профессиональным участником рынка ценных бумаг ОАО «ДЕРЖАВАИНВЕСТ» на внебиржевом рынке. Для приобретения Облигаций инвесторы должны обратиться по месту нахождения Эмитента или ОАО «ДЕРЖАВАИНВЕСТ» (220013, г. Минск, ул. Беломорская, д. 23, ком. 1Н, пом. 1-1) в рабочие дни с 10 до 13 часов в течение срока проведения продажи Облигаций.

**14. Срок обращения Облигаций**

Срок обращения Облигаций устанавливается с 3 августа 2011 года и ограничивается 30 декабря 2013 года включительно и составляет 880 календарных дней.

**15. Дата начала погашения Облигаций**

Датой начала погашения Облигаций является 30 декабря 2013 года.

**16. Доход по Облигациям**

Доход по Облигациям не начисляется и не выплачивается.

**17. Условия и порядок досрочного погашения Облигаций**

В случае досрочного окончания строительства объекта недвижимости, указанного в п. 10 Краткой информации, а также в случае досрочного прекращения договора страхования (досрочном отказе страхователя от договора страхования) в соответствии с п. 22 Краткой информации, Эмитент может объявить о досрочном погашении Облигаций.

Досрочное погашение Облигаций осуществляется на основании письменного заявления владельца Облигаций с приложением выписки со счета «депо», подтверждающей наличие требуемого количества Облигаций и возможность их отчуждения (отсутствие ограничений, связанных с обременением Облигаций обязательствами).

Владелец Облигаций после начала их досрочного погашения вправе получить номинальную стоимость Облигаций. Возврат денежных средств при досрочном погашении осуществляется в срок не позднее 180 (ста восьмидесяти) календарных дней.

Прочие условия досрочного погашения устанавливаются по аналогии с порядком погашения Облигаций, установленным п. 18 Краткой информации.

**18. Порядок погашения Облигаций. Дата формирования реестра владельцев Облигаций**

Владелец Облигаций при погашении (досрочном погашении) Облигаций имеет право получить номинальную стоимость Облигаций либо жилое помещение, общая площадь которого соответствует эквиваленту номинальной стоимости принадлежащих ему Облигаций, выраженному в квадратных метрах.

Владельцы Облигаций определяются на основании реестра владельцев Облигаций. Эмитент формирует реестр владельцев Облигаций за 5 (пять) рабочих дней до даты начала погашения Облигаций.

В случае намерения получить при погашении Облигаций их номинальную стоимость владелец Облигаций должен не позднее чем за тридцать календарных дней до даты начала погашения Облигаций в письменной форме уведомить Эмитента о таком намерении.

В случае наличия намерения получить при погашении (досрочном погашении) Облигаций соответствующее жилое помещение, начиная со дня начала погашения (досрочного погашения) Облигаций, владелец Облигаций и Эмитент подписывают акт приемки-передачи соответствующего жилого помещения.

При погашении (досрочном погашении) Облигаций владелец Облигаций должен перевести Облигации на счет «депо» Эмитента начиная со дня начала погашения Облигаций, но не позднее подписания акта приемки-передачи соответствующего жилого помещения.

**19. Условия и порядок приобретения Облигаций Эмитентом до даты начала их погашения**

В период обращения Облигаций Эмитент вправе осуществлять приобретение (выкуп) Облигаций у любого их владельца по цене, определяемой соглашением Эмитента и владельца Облигаций.

При неисполнении Эмитентом предусмотренных законодательством обязательств по договору, указанному в п. 13 Краткой информации, владельцы Облигаций вправе потребовать полного возмещения причиненных им убытков, а также возврата внесенных в оплату стоимости жилого помещения путем приобретения Облигаций денежных средств, проиндексированных путем умножения на коэффициент, определяемый отношением действующего на фактическую дату возврата средств индекса изменения стоимости строительно-монтажных работ, утверждаемого Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь по каждой области и г. Минску, к аналогичному индексу, действовавшему на дату перечисления владельцами Облигаций денежных средств в оплату стоимости жилого помещения путем приобретения Облигаций на счет Эмитента.

Индексы изменения стоимости строительно-монтажных работ определяются в соответствии с официально опубликованными данными Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь.

Возврат владельцам Облигаций денежных средств, внесенных в оплату стоимости жилого помещения путем приобретения Облигаций, в полном объеме осуществляется не позднее 6 месяцев с момента подписания акта о расторжении договора с Эмитентом (постановления суда – в случае отказа одной из сторон от подписания названного акта).

**20. Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании выпуска несостоявшимся, запрете выпуска Облигаций Департаментом по ценным бумагам**

Решением о выпуске Облигаций не предусматривается признания выпуска несостоявшимся.

В случае запрета выпуска Облигаций, Эмитент обязан в течение одного месяца с момента получения от Департамента по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь уведомления о запрещении выпуска Облигаций возвратить инвесторам средства, полученные в оплату размещенных Облигаций, и письменно уведомить Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь о возврате указанных средств инвесторам в полном объеме.

**21. Дата и номер государственной регистрации Облигаций**

Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 01 августа 2011 года.

Регистрационный номер: 5-200-02-1169.

**22. Информация об обеспечении исполнения обязательств**

Исполнение обязательств по Облигациям обеспечивается договором страхования ответственности Эмитента, заключаемым с Закрытым акционерным страховым обществом «Кентавр», далее именуемым – «страховщик».

Согласно принятому обязательству страховщик выплачивает владельцу Облигации суммы в рамках предоставленного обеспечения, причитающиеся владельцу указанных Облигаций, в случае, если Эмитент не выполнит своих обязательств;

Общая сумма обеспечения обязательств составляет 499 200 000 (четыреста девяносто девять миллионов двести тысяч) белорусских рублей;

Обязательства страховщиком исполняются в валюте номинала;

Обеспечение по обязательствам Эмитента в отношении Облигаций действует в течение 3 (трех) месяцев с даты начала погашения Облигаций.

В случае, если договор страхования будет расторгнут ранее окончания срока обращения Облигаций, Эмитент производит замену обеспечения исполнения обязательств по Облигациям либо принимает меры по досрочному погашению данного выпуска.

**23. Оплата Облигаций**

Оплата Облигаций производится путем безналичного расчета в установленном порядке. Денежные средства на оплату Облигаций подлежат перечислению на расчетный счет Эмитента.

Размещение Облигаций осуществляется по цене, определяемой Эмитентом в зависимости от рыночной ситуации на момент продажи.

Внесение юридическими и физическими лицами денежных средств Эмитенту, а равно Эмитентом при выплате стоимости Облигаций их владельцам в предусмотреных эмиссионными документами случаях осуществляется в валюте номинала Облигаций.

**24. Порядок обращения Облигаций**

Обращение Облигаций осуществляется среди физических и юридических лиц на внебиржевом рынке в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Для своевременного формирования депозитарием Эмитента реестра владельцев Облигаций сделки с Облигациями на вторичном рынке прекращаются за 5 рабочих дней до даты начала погашения Облигаций.

**Директор** **Войтенков Владимир Васильевич**
**Главный бухгалтер** **Климова Маргарита Октябрьевна**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## Адказы на сканворд

**Па гарызанталі:** Транспарцір. Аловак. Базар. Лось. Ярка. Ані. Лёд. Рука. Юнга. Кіп. Эрг. Адат. Джыгіт. Лекала. Манюка. Бак. Кар. Паліп. Кнот. Кашнэ. Ніл. Заір. Рызыка. Архар. Астат. Кадр. Манро. Касметыка. **Па вертыкалі:** Цыркуль. Адам. Анкер. Сенцы. Глюкоза. Хакі. Катар. Ака. Твар. Брук. Краска. Спадак. Танк. Залп. Чадра. Арава. Трос. Радэн. Пэр. Вена. Ірга. Драбіны. Каа. Лапік. Лінейка. Трак. Ладанка.

# І ПЕХАТОЙ... З ВІЦЕБСКА Ў СМАЛЕНСК

**Фестываль праваслаўнай моладзі ў Віцебску і раёне сабраў каля двухсот юнакоў і дзяўчат з розных краін.**

«Адзігітрыя» — такую назву мае гэты фестываль, які адбыўся на віцебскай зямлі вось ужо ў восьмы раз. Сваю назву ён атрымаў у гонар цудатворнай аднайменнай іконы. У праграме фестывалю — майстар-класы для званароў, па пляценні, ганчарным рамястве, а таксама моладзевы баль з удзелам членаў клуба гістарычнай рэканструкцыі, іншыя цікавыя мерапрыемствы. Па добрай традыцыі пад Віцебскам адкрыўся праваслаўны летнік «Дружба». Таленавітая праваслаўная моладзь у Летнім амфітэатры вечарам 3 жніўня дае канцэрт, уваход на які свабодны. Хрэсны ход у Смаленск на свята ў гонар іконы «Адзігітрыя» распачнецца раніцай У Віцебску 5 жніўня і будзе доўжыцца пяць дзён.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У Доме-музеі І з'езда РСДРП адкрываецца выстава вырабаў ручной работы

Выстава вырабаў майстроў-рамеснікаў «Hand Made — зроблена сваімі рукамі» адкрываецца сёння ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі «Дом-музей І з'езда РСДРП». Як паведамілі ў музеі, у экспазіцыі наведвальнікі змогуць убачыць работы, выкананыя ў розных тэхніках, стылях і відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: лямцаваляннi, роспісЕ па дрэве, скрапбукінгу, пластыку, вязанні, вышыўцы, батыку, бісерапляценні, жывапісе і іншых.

Плануецца, што выстава «Hand Made — зроблена сваімі рукамі» працягнецца да сярэдзіны жніўня.

**Аляксей ІВАНЮШКА,** *«Мінск—Навіны».*

# ГАЮЧЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ ЯБЛЫКАЎ



**Гаючыя ўласцівасці яблыкаў былі вядомыя нашым продкам здаўна. Яблыкі елі свежымі, сушылі, узімку варылі адвары з сухафруктаў, рабілі воцат, сок.**

- Самае галоўнае правіла здароўя было такім: «З'ядай па яблыку ў дзень — і табе не спатрэбяцца ніякія лекары».
- Народныя лекары раілі піць разведзены яблычны воцат ад высокага ціску
- Каб захаваць дзіця ад прыхільнасці да спіртнога ў будучым, у маленстве знахары павінны былі яго загаварыць. Пры гэтым дзіця трэба было карміць печаным яблыкам.
- З дапамогай яблыка народныя лекары выводзілі барадаўкі. Для гэтага патрабавалася разрэзаць яблык на столькі частак, колькі было барадавак. Кожнай часткай працерці барадаўку, затым яблык скласці ў цэлае і закапаць там, дзе ні чалавек, ні жывёла не ходзяць. Калі яблык у зямлі згніе, тады і барадаўкі знікнуць.
- Пакуль яблыкі і грушы не паспеюць, дрэва нельга трэсці, плады можна зрываць рукамі. Інакш на наступны год на гэтым дрэве ўраджаю не будзе наогул.
- Нельга было дапусціць, каб першыя яблыкі і грушы з маладога дрэва з'еў хто-небудзь чужы. Гаварылі, што тады завязь знікне не толькі на маладых, але і на старых дрэвах.
- 19 жніўня — Яблычны Спас. У абрадавай практыцы славян шанаванне яблыкаў знайшло адлюстраванне ў адным з галоўных свят, якім завяршаецца цыкл летніх сельскагаспадарчых прац. Легенда сведчыць, што ў дзень Яблычнага Спаса Бог адорвае душы ўсіх памерлых дзяцей райскімі яблыкамі — першымі пладамі новага ўраджаю.
- Жанчыны, якія страцілі дзяцей, раніцай 19 жніўня павінны сарваць некалькі яблыкаў, аднесці іх у храм, асвяціць і занесці на магілкі дзяцей. У тым выпадку, калі магіла дзіцяці далёка або зусім невядома дзе, варта асвячоны яблык пакласці на любую дзіцячую магілку або зрабіць яшчэ прасцей — пакінуць іх у храме.
- Асвечаныя яблыкі неслі на могілкі і разносілі на магілы ўсім памерлым сваякам.
- У дзень Яблычнага Спаса на стале асаблівай пашанай карысталіся яблыкі. Іх запякалі ў печы, дабаўлялі ў пірагі, дадавалі да бліноў. Праўда, цеста ў добрай гаспадыні было посным.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.24 | 21.07 | 15.43 |
| Віцебск — | 5.08 | 21.02 | 15.54 |
| Магілёў — | 5.14 | 20.57 | 15.43 |
| Гомель — | 5.17 | 20.47 | 15.30 |
| Гродна — | 5.41 | 21.21 | 15.40 |
| Брэст — | 5.48 | 21.15 | 15.27 |

**Месяц**

*Маладзік 30 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Імяніны**

*Пр.* *ПРАРОКА ІЛЫ, Абрама, Аляксандра, Апанаса, Георгія, Івана, Кузьмы, Сяргея, Фёдара, Ціхана.*

*К.* *Карыны, Марыі, Густава, Сцяпана.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




## Дзве даты

## 2 жніўня

**ДЗЕНЬ ПАВЕТРАНА-ДЭСАНТНЫХ ВОЙСК**
**ІЛЬІН ДЗЕНЬ**



**1840 год** — выйшаў указ расійскага цара Мікалая І аб спыненні дзейнасці на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года, помніка юрыдычнай думкі старажытнай беларускай дзяржавы.

**47 год да н.э.** — Гай Юлій Цэзар, разбіўшы баспорскага цара Фарнака ІІ, паслаў у сенат паведамленне: «прыйшоў, убачыў, перамог».

## Цытата дня:

***«Трэба, каб чалавек зразумеў, што ён — творца і ўладар свету, што на ім адказнасць за ўсе няшчасці Зямлі і што яму ж належыць слава за ўсё добрае, што ёсць у жыцці».***

**Рамен Ралан (1866—1944), французскі пісьменнік і грамадскі дзеяч.**

## Усміхнемся!

Муж вяртаецца дахаты ў чатыры раніцы. Жонка з парога:
— Дзе ты быў?
— У кінатэатры, і я буду цвёрда прытрымлівацца гэтай версіі!

☺

**Калі ўначы выйсці ў двор, легчы на зямлю і доўга глядзець на зорнае неба праз друшляк, то можна ўбачыць твар урача хуткай дапамогі.**

☺

Муж тэлефануе дадому. Трубку здымае жонка:
— Дарагая, сёння нам ніякі дурань не тэлефанаваў?
— Не, мілы, ты першы.

☺

**Тэлеканал «Культура» акупляецца толькі за кошт агарода, які знаходзіцца за тэлестудыяй.**

☺

Дыялогі ў сеціве.
— А вы мой ліст хіба не атрымалі?
— Ды хто ж твой почырк разбярэ?! Мы насілі яго ў аптэку расшыфроўваць, нам феназепам далі па ім!

☺

**Уся хвалёная мужчынская жалезная логіка для нас, жанчын, — проста металалом!**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 292 22 03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3660.

Нумар падпісаны ў 19.30 1 жніўня 2011 года.

| | |
|---|---|
| М | 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 |
| П | 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 |